**Гуткоўская Святлана Вячаславаўна,**
*загадчык кафедры харэаграфіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, прафесар (г. Мінск, Беларусь)*

# Беларускі танцавальны фальклор як аснова вучэбнай і творчай дзейнасці студэнта-харэографа

ЗАХАВАННЕ і арганічнае ўключэнне фальклору ў сучасную харэаграфічную практыку — першачарговая задача, якая стаіць перад спецыялістамі ў галіне народна-сцэнічнага танца.

Актыўна-пераўтваральнае стаўленне да фальклору, якое прадугледжвае як яго захаванне, так і арганічнае ўключэнне ў сучасную харэаграфічную практыку, — першачарговая задача, якая стаіць перад спецыялістамі ў галіне народна-сцэнічнага танца.

Заканамерна, што апора на нацыянальны фальклор з'яўляецца асновай прафесійнай падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва (напрамак "народны танец")» ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. У першую чаргу гэта тычыцца пытанняў выхавання балетмайстраў для калектываў народна-сцэнічнага танца: неабходна, каб тыя, хто займаецца сцэнічнай інтэрпрэтацыяй фальклору, добра ведалі яго матэрыялы, рэзервы, спецыфічныя асаблівасці, заканамернасці функцыянавання.

На кафедры харэаграфіі БДУКМ створана і паспяхова рэалізуецца сістэма навучання студэнтаў рабоце з фальклорным матэрыялам, галоўная мэта якой — фарміраванне гатоўнасці студэнтаў-харэографаў да гэтай работы.

Праблеме выкарыстання фальклору падчас навучання харэографаў прысвечаны шэраг навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры, у якіх абгрунтоўваецца неабходнасць спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў для работы з нацыянальным фальклорам [4]; раскрываецца змест паняццяў «харэаграфічны фальклор», «узор народнай танцавальнай творчасці», «кампазіцыя народнага танца», «пластычны матыў» [1, 3]; распрацоўваюцца прынцыпы класіфікацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай харэаграфіі [7]; вызначаюцца спосабы сцэнічнай апрацоўкі фальклорных першакрыніц [1, 2, 3]; разглядаюцца аспекты ўзаемадзеяння танцавальнага фальклору і беларускага народна-сцэнічнага танца [6] і танцавальных жанраў эстрады [5] і г. д.

Існуе праграма ўзаемадзеяння спецыяльных дысцыплін па арыентацыі на мэтанакіраваную работу з фальклорам. Так, яго вывучэнне ў тэарэтычным аспекце адбываецца на дысцыпліне «Этнаграфія, міфалогія, фальклор беларусаў». Тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў-харэографаў, якая прадугледжвае вывучэнне агульных прынцыпаў класіфікацыі беларускага харэаграфічнага фальклору, знаёмства і параўнанне з класіфікацыйнымі сістэмамі ў замежнай народнай харэаграфіі, здзяйсняецца на дысцыпліне «Гісторыя харэаграфіі і аналіз харэаграфічных твораў». На лекцыйных і семінарскіх занятках па «Беларускай харэаграфіі» вывучаюцца пытанні сувязі танца з абрадамі, побытам, звычаямі, працоўнай дзейнасцю; адбываецца знаёмства з элементамі харэаграфіі ў каляндарна-гадавой і сямейна-бытавой абраднасці і г. д. У дадзеным курсе разглядаюцца тэмы «Балетныя творы беларускіх аўтараў на фальклорную, гістарычную і літаратурную тэматыку», «Творчая дзейнасць прафесійных і аматарскіх харэаграфічных калектываў Беларусі» і інш. На дысцыпліне «Беларускі танец» студэнты вывучаюць рэгіянальныя асаблівасці народнай харэаграфіі, на занятках па «Харэаграфічнаму ансамблю» знаёмяцца з лепшымі ўзорамі беларускіх народна-сцэнічных танцаў, створанымі вядомымі харэографамі і студэнтамі кафедры.

Пошукі кафедрай метадычнага напрамку цесна звязаны з сучаснай сцэнічнай практыкай. Ю. М. Чурко падкрэслівае, што «ў якасці першачарговай задачы вылучаецца праблема ўмацавання і пашырэння сувязей сцэнічнага танца з фальклорным, праблема фундаментальнага вывучэння ўсяго арсенала сродкаў народнай творчасці. Асвоены пакуль толькі параўнальна невялікі верхні пласт фальклору, і на сцэне выконваецца толькі малая частка наяўных у ім багаццяў» [8, *58*].

Кафедрай харэаграфіі распрацавана методыка падрыхтоўкі спецыялістаў да работы з танцавальным фальклорам, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадугледжвае ўсе этапы гэтай работы ад збору матэрыялу да стварэння сцэнічнага твора на яго аснове, і, такім чынам, уключэння фальклору ў сучасны мастацкі працэс. «Асаблівую ролю адыгрывае наяўнасць запісаў фальклору, фіксацыя вобразаў танцавальнай творчасці народа. Твор народнай харэаграфіі шматслаёвы, ён заўсёды валодае спектрам патэнцыяльных магчымасцей, якія дазваляюць ствараць на сцэне самыя розныя яго інтэрпрэтацыі (што, дарэчы, і абумоўлівае жыццё народнага танца доўгія гады і магчымасць атрымання эстэтычнай асалоды ад яго многім пакаленням). Наяўнасць фіксаванага запісу фальклорнай першакрыніцы дазволіць не «знішчаць» яго сцэнічнымі распрацоўкамі, як гэта нярэдка адбываецца цяпер, а кантраляваць ідэйна-эстэтычную вернасць сачынення па адносінах да арыгінала. Наяўнасць запісу народнага танца дазволіць іншым харэографам даць яму іншыя сцэнічныя трактоўкі» [8, *59*].

Велізарную ролю ў гэтым напрамку адыграла стварэнне ў 1981 г. пры кафедры харэаграфіі Галіновай навукова-даследчай лабараторыі (ГНДЛ) беларускай танцавальнай творчасці, працэс арганізацыі і станаўлення якой звязаны з імем доктара мастацтвазнаўства, прафесара Юліі Міхайлаўны Чурко. Асноўнымі мэтамі лабараторыі з'яўляюцца збор, навуковая сістэматызацыя і аналіз узораў беларускай народнай танцавальнай творчасці, стварэнне своеасаблівага фальклорнага «банка» і харэаграфічнага атласа Беларусі, публікацыя навуковых прац і самае асноўнае — укараненне вынікаў даследаванняў у працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва, у практычную дзейнасць аматарскіх і прафесійных калектываў.

Пачынаючы з 1981 г. супрацоўнікі лабараторыі штогод арганізоўвалі некалькі фальклорных экспедыцый па розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, у якіх прымалі ўдзел студэнты і выкладчыкі кафедры. Летняя палявая экспедыцыя ў якасці фальклорнай практыкі ўваходзіла ў вучэбны план. Сабраны матэрыял у разнастайнасці яго сувязей з гістарычнымі, геаграфічнымі і сацыяльнымі ўмовамі існавання, у адзінстве музычнага, пластычнага, вакальнага і гульнявога пачаткаў фіксаваўся славесна-графічным спосабам, а таксама на кіна- і фотаплёнку. Усяго за 10 гадоў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

рэгулярнай экспедыцыйнай працы было даследавана 766 вёсак з 104 раёнаў краіны. У выніку былі складзены алфавітны, жанравы (электронны варыянт) ітапаграфічны каталогі; фона-, нота-, фота-, слайда- і фільматэкі, у якіх на сённяшні дзень налічваецца 17 тысяч адзінак захоўвання.

Па матэрыялах, якія захоўваюцца ў лабараторыі, напісана больш за 150 артыкулаў для энцыклапедый «Літаратура і мастацтва Беларусі», «Этнаграфія Беларусі», «Тэатральная Беларусь», «Беларускі фальклор», «Рэспубліка Беларусь: Рэгіёны Беларусі», «Культура Беларусі» і іншых; апублікаваны даведачныя выданні «Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні» і «Карагоды, танцы, гульні: наяўнасць фальклорных матэрыялаў у фондах Галіновай навукова-даследчай лабараторыі беларускай танцавальнай творчасці»; выдадзена серыя рэпертуарных зборнікаў «Беларускі фальклор на самадзейнай сцэне»; абаронены кандыдацкія і магістарскія дысертацыі; напісана манаграфія «Беларускі харэаграфічны фальклор», шэраг вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, прысвечаных пытанням сцэнічнай інтэрпрэтацыі фальклору, і многае іншае. Частка экспедыцыйных матэрыялаў пераведзена на лічбавыя носьбіты.

Прыярытэтным напрамкам работы ГНДЛ з’яўляецца выдача запісаў, зробленых у фальклорных экспедыцыях, для іх выкарыстання ў практычнай пастановачнай рабоце студэнтаў, паколькі праграма вядучай спецдысцыпліны «Мастацтва балетмайстра», на якой студэнты атрымліваюць веды, асвойваюць прыёмы і навыкі па сачыненню танцавальных твораў, складзена з улікам актыўнага выкарыстання імі фальклорнай спадчыны беларускага народа.

Такім чынам, падчас навучальнага працэсу студэнтам паступова прывіваюцца ўменні і навыкі работы з танцавальным фальклорам. Далей на гэтай жа аснове ажыццяўляецца пастановачная работа па стварэнню скончаных харэаграфічных кампазіцый.

Выкладчыкамі кафедры распрацавана спецыяльная методыка стварэння сцэнічных нумароў на аснове ўзораў народнай танцавальнай творчасці. Згодна з ёй цэласны, звязаны з выкарыстаннем фальклору працэс творчай дзейнасці харэографа-пастаноўшчыка падзяляецца на некалькі ўзаемазвязаных этапаў, якія ўключаюць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— вывучэнне матэрыялаў па танцавальнаму фальклору і збор інфармацыі аб канкрэтным танцавальным узоры;

— пластычнае «ажыўленне» пісьмова зафіксаванага ўзору, абранага за аснову будучай пастаноўкі (вылучэнне асноўнага пластычнага матыву, кампазіцыйнага фрагмента і т. п. з мэтай іх далейшага развіцця);

— выбар спосабу сцэнічнай апрацоўкі фальклору (выкананне аўтэнтычнага ўзору, прыстасаванага да сцэнічнай прасторы; мастацкая апрацоўка фальклорнага ўзору, якая прадугледжвае змяненне і развіццё твора з мэтай вырашэння пэўных творчых задач; творчая распрацоўка фальклорнай першакрыніцы, г. з. стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі па матывах фальклорнага ўзору; стварэнне аўтарскага твора без прамога цытавання фальклорнага твору);

— практычнае ўвасабленне задумы сцэнічнай кампазіцыі на аснове засвоеных фальклорных матэрыялаў.

На III курсе студэнты ствараюць буйную форму, так званую фальклорную вечарыну, у якой аб'ядноўваюцца ў адзіную праграму са скразной драматургіяй, якая паказваецца гледачам. Так, студэнты кафедры падрыхтавалі фальклорныя вечарыны «Каляда ідзе», «Гуляем у проса», «З мінуўшчыны ў дзень сённяшні», «Ля крыніцы», «Вялікдзень на Беларусі», «Танчым па-даўнейшаму», «Будзе жыта, будзем сыты!», «Вяртанне да саміх сябе», «Каму пашанцуе, той і станцуе» і інш.

На IV — V курсах студэнтамі ажыццяўляецца пастаноўка нумароў на аснове фальклору з выкарыстаннем выразных сродкаў, якія адпавядаюць павевам часу, і самых разнастайных балетмайстарскіх прыёмаў, якія ўключаюць паліфанічныя прыёмы выкладання харэаграфічнай фактуры. Часта адбываецца сінтэз народнай і сучаснай пластыкі розных напрамкаў. Эксперыментальны падыход да стварэння харэаграфічных кампазіцый на матэрыяле фальклору закранае перш за ўсё форму і галоўным чынам праяўляецца ў выбары новых спосабаў арганізацыі танцавальнага матэрыялу, што абумоўлена ў значнай ступені і ўплывам сучасных дасягненняў сумежных мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, студэнтаў узбройваюць ведамі аб асноўных жанрах беларускай народнай танцавальнай творчасці з выяўленнем іх адметных рыс і асноўных характарыстык, абавязкова тлумачачы пры гэтым, што беларуская народная харэаграфія з'яўляецца складанай часткай харэаграфіі народаў свету. Студэнты вывучаюць спосабы мастацкай інтэрпрэтацыі танцавальнага фальклору, узроўні і прыёмы трансфармацыі матэрыялу фальклорнага ўзору, знаёмяцца з праблемамі захавання фальклорнай спадчыны, з пытаннямі дынамікі развіцця народнай танцавальнай культуры, механізмамі перадачы яе з пакалення ў пакаленне.

Павелічэнне ўвагі да фальклору ва ўстановах вышэйшай адукацыі (УВА), як паказвае практыка, дае станоўчыя вынікі: даследаванні ў галіне фальклору, праведзеныя студэнтамі падчас навучання, ствараюць магчымасці для непасрэднага ўкаранення іх вынікаў у творчую пастановачную дзейнасць, для пэўнай эксперыментальнай работы ў галіне сцэнічнай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў і, такім чынам, для далейшага паспяховага развіцця танцавальнага мастацтва Беларусі ў цэлым.

Пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў вядзецца пастаянная творча-эксперыментальная работа па сачыненні студэнтамі арыгінальных танцавальных кампазіцый на матэрыяле народнай творчасці, і створаны спрыяльныя ўмовы для спроб ажыццявіць на практыцы розныя мастацкія эксперыменты ў гэтай галіне.

Безумоўна, многія пытанні кафедрай яшчэ не вырашаны, але істотна, што нацыянальны фальклор стаў адным з найважнейшых фактараў навучання будучых харэографаў і прыносіць бачныя вынікі. Шмат балетмайстарскіх студэнцкіх твораў увайшло ў рэпертуар самадзейных і прафесійных калектываў рэспублікі, у тым ліку і ў канцэртныя праграмы заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі. Дзякуючы сур'ёзна прадуманай сістэме навучання студэнты-харэографы маюць магчымасць яшчэ ва ўніверсітэце самастойна прайсці ўсе стадыі навукова-творчай працы з фальклорным матэрыялам — ад збору і запісу да стварэння на яго аснове твораў сцэнічнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Можна канстатаваць, што прафесійная падрыхтоўка кадраў у галіне танцавальнага мастацтва на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мае свае адметныя, характэрныя асаблівасці, якія праяўляюцца перш за ўсё ў глыбокім тэарэтычным вывучэнні нацыянальнага фальклору і мэтанакіраванай практычнай дзейнасці па яго сцэнічнай інтэрпрэтацыі. Прафесійная падрыхтоўка будучых харэографаў разглядаецца кафедрай як сістэма каштоўнаснага арыентавання студэнтаў на работу балетмайстра, які абапіраецца ў сваёй творчай дзейнасці на фальклорную спадчыну беларускага народа, што дазваляе мадэляваць асобу выпускніка як вынік прафесійнага станаўлення.

*Літаратура*

1. *Беляева, О. П.* Работа балетмейстера по созданию сценической композиции на основе белорусского хореографического фольклора / О. П. Беляева // Культура : открытый формат-2011 : сб. науч. работ / БГУКИ; под науч. ред. М. А. Можейко. — Минск, 2011.
2. *Гуткоўская, С. В.* Гарадскія бытавыя танцы : вучэб.-метад. дапаможнік / С. В. Гуткоўская. — Мінск, 2008.
3. *Гуткоўская, С. В.* Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове харэаграфічнага і музычнага фальклору : вучэб. дапам. / С. В. Гуткоўская, Н. М. Хадзінская. — Мінск, 2000.
4. *Гуткоўская, С. В.* Танцавальны фальклор у сістэме падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» / С. В. Гуткоўская // Зборнік навуковых прац удзельнікаў VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання», Мінск, 27—29 красавіка 2012 г. / БДУКМ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) і [інш.]. — Мінск, 2012.
5. *Карчевская, Н. В.* О некоторых аспектах взаимодействия танцевального фольклора и танцевальных жанров эстрады / Н. В. Карчевская // Зборнік навуковых прац удзельнікаў V Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання», Мінск, 29 красавіка — 1 мая 2011 г. / БДУКМ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) і [інш.]. — Мінск, 2011.
6. *Коновальчик, И. В.* Белорусский народно-сценический танец : состояние и перспективы / И. В. Коновальчик // Культура : открытый формат-2011 : сб. науч. работ / БГУКИ; под науч. ред. М. А. Можейко. — Минск, 2011.
7. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. — Мінск, 1990.
8. *Чурко, Ю. М.* Хореография в зеркале критики : сб. ст. / Ю. М. Чурко. — Минск, 2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ